

Яўген Петрашэвіч

## З успамінаў пра гарадзенскіх пісьменнікаў. АЛЯКСЕЙ КАРПЮК

Аднойчы ўпальным летам я ў цянёчку, на ўскрайку леса, што ў нас называюць Пышкі, граю сабе на дудачцы і слухаю, як адгукаецца лес на мае мелодыі. А ён, сапраўды, адгукаецца – нібы апладысментамі.

Нечакана бачу: едзе на ровары Аляксей Карпюк, голыя плечы, без сарочкі. Ён як пачуў дудачку, дык кінуў ровар і напралом цераз кусты да мяне крочыць.

– Добры дзень, Аляксей Нічыпаравіч! – прывітаўся я з ім.

– Цьфу! – расчаравана неяк кажа ён. – Я думаў, грае пастушок, а гэта Петрашэвіч.

***

У Пышках, што недалёка ад вуліцы Каліноўскага, Аляксей Нічыпаравіч вёў унучку за ручку, а я якраз з лесу яму насустрач выходзіў. Прывіталіся.

– Вось ты доўгія валасы адгадаваў, кампазітар, а ці ведаеш народныя песні? – спытаў ён.

– Помню, як мая бабуля Фядора спявала, – адказваю. І заспяваў:

Зязюленька, птушка шэра,
Не на тую ёлку села,
Пералётывай на грушу,
Перадай паклон Андрушу… – Гэта нашыя карані.

Аляксей Нічыпаравіч адпусціў унучку, што вёў за ручку, і пакуль мы ішлі разам, усё паўтараў: карані, ка-ра-ні…

***

Іду неяк па вуліцы Элізы Ажэшкі, як раптам з акна яе доміка, дзе тады размяшчаўся Саюз пісьменнікаў Беларусі, Аляксей Нічыпаравіч заклікае да сябе.

Зайшоў, павіталіся.

– Сядай, – кажа, а сам штосьці піша. Потым устаў, падаў мне кніжку сваю новую «Карані» з аўтографам.

***

Аляксей Нічыпаравіч вёў здаровы і творчы лад жыцця. У гады гарбачоўскіх рэформ па барацьбе за цвярозасць трапіў Карпюк у Азербайджан, каб падтрымаць гэтую здаровую плынь і там. І быў вельмі здзіўлены і абураны, калі пасля ўрачыстага «цвярозага сходу» яго, як госця з Беларусі, запрасілі на банкет, каб адзначыць гэтую значную падзею.

На банкеце ён быў, еў, але не піў. А калі пакідаў застолле, сказаў:

– Першую гадзіну госць – золата,
Другую гадзіну – срэбра,
А трэцюю гадзіну – медзь,
Пара і шапку адзець!

***

Ва ўрачыстасці ў Новым Замку, прысвечанай нараджэнню пісьменніка, бралі ўдзел і мае «Дударыкі». Мы праспявалі песню, прысвечаную Аляксею Нічыпаравічу. Вось яе словы:

Выйду падзівіцца на прадвесне,
прывітаць у небе жаўрука –
адчуваю нараджэнне песні
для душы гаротнай Карпюка.

Ён любіў паслухаць плач жалейкі,
па-над Нёмнам – песню рыбака…
Знаў яго дарослы і маленькі,
з кіем, мудраца і дзівака.

Сёння Беларусь яго святая,
для якой хацеў адно дабра,
як прарока, песняра вітае,
стойкага за волю змагара.

Будзе вецер абдымаць і песціць
Беларусь-матулю і ў вяках.
Ёсць у Гродне творцы, хлеб і песні,
не хапае толькі Карпюка.